УДК 821.161.3.0

# ХРЫСЦІЯНСКІЯ КАШТОЎНАСЦІ ЯК АСНОВА ЭСТЭТЫЧНАГА ІДЭАЛУ ПАЭЗІІ УЛАДЗІСЛАВА СЫРАКОМЛІ

**Косціна Жанна Вячаславаўна**
старшы выкладчык кафедры філалогіі ўстановы адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт»

*У артыкуле разглядаецца паэзія Уладзіслава Сыракомлі з мэтай выяўлення хрысціянскіх каштоўнасцей як асновы эстэтычнага эдэалу ў творчасці Лірніка Літвы. Аналіз твораў «Над калыскай», «Хадыка», «Акраец хлеба».*

Выдатны рускі мысліцель Ільін Іван Аляксандравіч выказаў думку пра тое, што «карані сапраўднага мастацтва заўсёды маюць духоўна-рэлігійны характар» [1, с. 34]. На працягу стагоддзяў рэлігія вызначала сістэму духоўных каштоўнасцей чалавека. Яна фарміравала светапоглядныя асновы жыцця беларускага народа ўвогуле. Хрысціянскія тэмы, матывы і вобразы, якія перманентна функцыянуюць у літаратуры Беларусі XIX стагоддзя, сведчаць пра яе ўзаемасувязь з сусветным і еўрапейскім літаратурным працэсам, а таксама з рэлігійнымі, культурнымі і літаратурнымі традыцыямі мінулага [2, с. 132].

Эстэтычны ідэал выступае асноўнай катэгорыяй мастацкай літаратуры. Пытанне эстэтычнага ідэалу даўно прыцягвае да сябе ўвагу даследчыкаў як у тэарэтычным, так і ў метадалагічным плане (Г.М. Паспелаў, Ю.Б. Бораў, В.Я. Халізеў). У апошнім выпадку неабходна падкрэсліць, што ён уяўляе сабой вызначаны прынцып даследавання мастацкіх твораў, які скіраваны на пазнанне індывідуальна-непаўторнага і гістарычна-тыпалагічнага ў творчым вопыце пісьменніка. Яго сфера – літаратурныя феномены, якія з’явіліся дзякуючы намаганням творчай асобы. Эстэтычны ідэал – адна з самых складаных катэгорый эстэтыкі. Літаратуразнаўчае тлумачэнне паняцця дакладна акрэсліў В.П. Рагойша: «Ідэал эстэтычны – выяўлены ў канкрэтна-пачуццёвай форме ўзор эстэтычнай дасканаласці чалавека і чалавечага жыцця. Цесна звязаны з іншымі грамадскімі ідэаламі (эстэтычным, сацыяльным, палітычным і інш.), але, у адрозненне ад іх, не можа існаваць як абстрактнае паняцце. Сфера яго бытавання – творы мастацтва, у першую чаргу – мастацкай літаратуры. У той час як форма ўвасаблення ідэалу эстэтычнага – розныя віды мастацтва, характар яго, аднак, прадвызначаецца самім жыццём, жаданнем абнавіць, палепшыць яго згодна ўяўленню чалавека аб прыгожым жыцці. У кожнага сваё разуменне прыгожага жыцця, ды паколькі людзі жывуць у пэўную эпоху, належаць да пэўных дзяржаўных, нацыянальных, сацыяльных супольнасцей, ідэал эстэтычны мае часавы, нацыянальны, сацыяльна-класавы характар» [3, с. 133].

Неабходнасць разгляду эстэтычнага ідэалу паэзіі Уладзіслава Сыракомлі тлумачыцца тым, што хрысціянскія

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

каштоўнасці, якія выступаюць побач з гармоніяй, асноўнай катэгорыяй эстэтычнага ідэалу, могуць па-рознаму тлумачыцца ў залежнасці ад магістральных рухаў і тэндэнцый развіцця грамадства, пад знакам якіх праходзіць тая або іншая эпоха. Беларускае літаратуразнаўства (А.А. Лойка, М.А. Лазарук, А.А. Семяновіч, У.і. Мархель) доўгі час не разглядала ў якасці асновы эстэтычнага ідэалу масіў хрысціянскай культуры, што была дамінуючай у жыццеўпарадкаванні нашых продкаў.

Асэнсаванню праблемы каштоўнасцей, ролі паэта ў жыцці народа прысвяціў сваю творчасць У. Сыракомля, якога называлі Лірнікам вясковым, Лірнікам Літвы. Такія азначэнні дазваляюць без цяжкасцей акрэсліць жыццёвыя і творчыя прынцыпы выдатнага паэта, крытыка, публіцыста, краязнаўца, шчырага абаронцы простага чалавека. У праграмным вершы «Над калыскай» лірычная гераіня – Маці-Радзіма, спяваючы калыханку сыну, замоўляе лёс свайму дзіцяці, каб яго мінула кар'ера вайскоўца, духаўніка, інжынера. Яна жадае сыну «зрабіцца вялікім паэтам»: «Патрэбны вяшчун нам, патрэбны прарок нам, // Каб меў ён і ліру і спеў перуновы, // Каб гэтаю песняй і ясным каб вокам, // Як сонца, ёп шлях асвятляў нам баёвы. // З'явіся, паэце! Магчыма, сягоння //Прыйшоў ты на свет наш чаканае здзейсніць» [4, с. 36].

«Прарок», «вяшчун», «паэце» – вось хто, на думку У. Сыракомлі, неабходны чалавеку, які шукае ісціну, веру, святло. Беларус з даўніх часоў шанаваў, паважаў тых, хто звяртаецца да яго са словам, бо ні музыка, ні танец, ні жывапіс не вабяць яго так, як па-мастацку сказанае слова. Лірычная гераіня папярэджвае малое дзіцятка аб высакародным і трагічным лёсе паэта: «Цяжкая чакае цябе узнагарода! – // Цярновы вянец па чале тваім будзе. // І грымне варожасць каменнем у грудзі. // Не здумай заплакаць! Пакуты наслання // Табе, нібы зоркі начэснай праменне. // Па свеце затым і было ўкрыжаванне. // Каб сэрцу мілейшым было ўваскрасенне» [4, с. 36]. Хрысціянская сімволіка, алегарычныя вобразы «цярновага вянца», «укрыжавання», «уваскрашэння» ставяць паэта, паводле Сыракомлі, побач з Ісусам Хрыстом, які сваімі натхнёнымі словамі заклікаў любіць Бога, клапаціцца пра бліжняга, рабіць дабро. Але для Сыракомлі паэт — яшчэ і асоба з выразнымі нацыянальнымі рысамі, дэмакратычнымі арыентацыямі, бо спяваць можна толькі «цудоўнаю матчынай мовай», бо толькі тады «ўвойдзе дух новы ў сэрца народу». Біблейскі Ісая, антычны Гамер, міфалагічны Арфей – вось побач з кім ставіцца народны паэт. І таму яго слова павінна гучаць, як біблейскае натхнёнае казанне, па-гамераўску эпічнае і маштабнае, а мелодыя вершаў – абуджаць, як спеў Арфея, эмоцыі, раскрываць мілагучнасць матчынай мовы. Лірычны герой Лірніка вясковага па сваёй эстэтычна-філасофскай сутнасці блізкі да міфалагічнага Арфея. Не выпадкова ягоны музычны інструмент – ліра. «Ліра мая ты спеўная! З чараўнічага дрэва, // Мусіць, ты змайстравана. // Ледзь вазьму цябе ў рукі, ўсе, як ёсць, твае гукі, // І песняй я ўвесь забраны» [4, с. 46].

У многіх гавендах Уладзіслава Сыракомлі галоўным вобразам становіцца дробны шляціц, мужык, бедны чалавек. У іх паэт сцвярджае непахісны маральны стрыжань гэтай асобы, якая імкнецца жыць па хрысціянскіх законах любові, пашаны да Бога, да бліжняга (вобраз старога ратаяЛагоды з гавэнды «Акраец хлеба»), таго ж, хто пераступіць цераз адну з дзесяці запаведзяў, чакае пакаранне, а галоўны суддзя – сумленне чалавека («Паштальён», «Хадыка», «П'яны бядак»). Станоўчы герой паэзіі Сыракомлі ў першую чаргу – пачуццёвая асоба, якая адчувае хараство, красу, што напаўняюць Божы свет.

У старога Лагоды з гавэнды «Акраец хлеба» быў заўсёды добры ўраджай, бо ён шчыра маліўся, шчыра радаваўся, «травіцы і кветцы ўсміхаўся», адчуваў «зямлі хараство», «свет дзівосны прыроды». А яшчэ дзве якасныя характарыстыкі станоўчага героя – працавітасць і сумленнасць. Гэтыя рысы характару прысутнічаюць у вобразе старога ратая Лагоды. Ды і паэт, на думку Сыракомлі, не павінен забываць аб працы на зямлі. «Тут я ў радасці, ў нягодзе // з рукапісам і матыкай» [4, с. 30].

Герой гавэнды «Хадыка» – вобраз драматычны. Хадыка засек лоўчага і, каб пазбегнуць кары, трыццаць год пасля забойства хаваўся ад людскога вока ў пушчы. Але сумленне прымусіла гаротніка пакаяцца, ачысціцца ад граху, прыйсці да ваяводы з пакорай. Споведзь, якую слухаюць у судзейскай зале, гучыць страшна, бо Хадыка сатварыў грэх забойства, забойства брата свайго. Бо па Бібліі ўсе людзі браты. Апостал Пётр у сваіх Пасланнях звяртаўся да чытачоў як да братоў. Гэта братазабойства – грэх Каіна, які, па зайздрасці забіўшы брата свайго Авеля, быў вымушаны стаць выгнаннікам: «І сказаў (Гасподзь): што ты зрабіў? Голас крыві брата твайго лямантуе да Мяне ад зямлі. І зараз пракляты ты будзеш апрацоўваць зямлю, яна не будзе больш даваць сілы для цябе, ты будзеш выгнаннікам і бадзягам» (Бц 4: 10-13). Як і Каін, Хадыка панёс цяжкае пакаранне. Ён адрокся ад чалавечага жыцця, як звер, жыў у пушчы, дзе нельга было пачуць чалавечага голасу: «Я пакутаваў гэтак, як дух той маркотны, // Што ў вярбіне сухой скаргі ўзносіць да неба: // Працаваў са слязамі, еў з хлебам гаркоту, // Дзе там хлеб? Што я даў бы за скібачку хлеба! // О, што значыць скарынка ў радзімым куточку! // Хата! Цёплы спакой! І праснак на вячэру! [4, с. 102]

Але не з зайздрасці, у адрозненне ад Каіна, Хадыка забіў лоўчага. Сыракомля ў гэтым творы праз сюжэтную лінію раскрывае адну з заган чалавека – п'янства. Хадыка за сваю нецвярозасць панёс страшэннае фізічнае пакаранне: прывязаўшы да дрэва, яго «лупцавалі гарапнікам з тоўстага дроту». У запале гневу, спакушаны сатаной, Хадыка забівае лоўчага. І чырвоныя плямкі чалавечай крыві на адзенні трыццаць год не даюць супакою сумленню: «Глупствасуд чалавечы! У сэрцы глыбока – // Горшы суд... Там сумлсние адно валадарыць // Зуб за зуб патрабуе і вока за вока... [4, с. 101].

Звярынае жыццё ў пушчы знясіліла Хадыку. Шмат разоў спакушаў яго чорт на нядобрую справу: стаць разбойнікам, які рабуе людзей на дарогах, і нават закончыць жыццё самагубствам, павесіўшыся на дрэве. Але Бог, да якога галоўны герой звяртаецца ў думках кожны раз, не даваў зрабіць гэтага. Хадыка бярэцца за працу, бо толькі тут убачыў выратаванне ад вар'яцтва. Ён закладвае пчэльнік: «Гаспадарка ў бары – гэта ж дзіўнае дзіва. // Не для ўласных патрэб, не на продаж у месце, Хіба можна мне з мёдам туды патыкацца. // А для працы, карысці... ды так сабе, ўрэшце. // Для людзей, бо на іх жа трымаецца праца. // Што ж я варты без працы? [4, с. 106]

Хрысціянін Уладзіслаў Сыракомля канстатуе яшчэ адзін вывад героя: у душу чалавека не можа вярнуцца супакаенне, калі ён не пакаецца перад людзьмі. Таму выгнаннік вяртаецца ў вёску, але яго там не пазнаюць, уцякаюць ад яго, як ад вар'ята. Такога ганебнага стану Хадыка не вытрымлівае, хоць і ведае, што гэта нябеснае пакаранне. Ён ідзе ў суд са споведдзю і раскаяннем. Хадыка памёр у кляштары, сярод людзей. Бог даў яму спакойную смерць, таму што пакаянне яго было доўгім, цяжкім і ішло ад самага сэрца. Любоў да бліжняга, жаданне пакаяцца ў сваіх грэшных учынках, праца – вось што павінна быць у аснове быцця чалавека, кіраваць паводзінамі людзей.

Такім чынам, эстэтычны ідэал паэзіі Уладзіслава Сыракомлі грунтуецца на хрысціянскіх каштоўнасцях, якія дамінавалі ў жыццеўпарадкаванні нашых продкаў.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Ильин, И. А. Поющее сердце / И. А. Ильин // Наш современник. – 1991. – С. 181.
2. Коўтун, В. Хрысціянскія матывы ў творчасці Янкі Купалы і Цёткі: Вобразна-эстэтычны аспект нацыянальнай мастацкай свядомасці: зборнік навуковых артыкулаў выкладчыкаў кафедры беларускай літаратуры. – Мазыр, 2008. – С. 132–135.
3. Рагойша, В. П. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах : дапам. / В. П. Рагойша. – Мн. : Беларуская энцыклапедыя, 2001. – 384 с.
4. Сыракомля, У. Выбраныя творы / Уладзіслаў Сыракомля. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – 548 с.

И

ий
ни-

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова